**Майсеенка, М. У.** «Вайна прыходзіла ў сны, трывожыла раны» / М. У. Майсеенка ; гутарыла К. Дзеравяга // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 21 лют. — С. 6.

## «ВАЙНА ПРЫХОДЗІЛА Ў СНЫ, ТРЫВОЖЫЛА РАНЫ»

*Дваццаціголдзе з дня вываду савецкіх войск з Афганістана. Гэта дата стала нагодай для сустрэчы з землякамі, якія служылі ў Афганістане і сумленна выконвалі свой воінскі абавязак. Сёння пра тыя далёкія падзеі ўспамінае былы воін-інтэрнацыяналіст з Ломашаў, механізатар філіяла «Ломашы-Агра» Мікалай Уладзіміравіч Майсеенка.*

***– З чаго пачыналася Ваша служба?***

– У армію я прызываўся з Хойніцкага раёна, пачынаў службу ў Туркменістане. Вучылі нас усяму: страляць, упраўляць танкам, аказваць першую медыцынскую дапамогу, прыстасоўвацца да новых кліматычных умоў, палітзаняткі таксама праводзіліся. Затым наш мотапяхотны полк перакінулі ў правінцыю Газні, што ў 120-ці кіламетрах ад Кабула. Наша задача была – суправаджаць і ахоўваць калоны з грузамі.

***– Як складваліся ўзаемаадносіны паміж ваеннымі і мірнымі жыхарамі?***

– Мы выконвалі і міратворчую місію: развозілі прадукты, медыкаменты па кішлаках, дапамагалі ў вырашэнні бытавых праблем. Напрыклад, электрычнасць праводзілі, таму і адносіны ў нас былі міралюбівыя. Аднойчы мы нават пабывалі на мясцовым вяселлі. Накармілі нас нечым смачным, а вось спіртнога там наогул не бывае, вера не дазваляе.

***– Якія эпізоды афганскай службы засталіся ў Вашай памяці?***

– Наша ваенная база размяшчалася ля падножжа гор. А горы – гэта такая прыгажосць, асабліва калі іх схілы чырванеюць ад макаў у промнях заходзячага сонца! Паабапал дарог экзотыка: руку працягні – і поўная жменя персікаў ды мандарынаў. Нават не верылася, што тут ідзе вайна. Напачатку службы ў Афганістане я быў стажорам у механіка-вадзіцеля. Пазней сам стаў танкістам. Упраўляць машынай было не складана, але трэба было несці адказнасць за ўсіх членаў экіпажа. Усялякае здаралася: траплялі пад абстрэл, трымалі абарону высока ў гарах, дзе было холадна, не хапала кіслароду не толькі людзям, але і тэхніцы. А ад холаду нас ратавалі нашы танкі: мы грэліся ля матораў.

Калі служыць заставалася зусім нямнога, наша калона трапіла пад абстрэл. Мой танк падарваўся на міне. Усе мы атрымалі цяжкія кантузіі і раненні рознай цяжкасці, але ўсе засталіся жывымі. Затым быў шпіталь у Кабуле, далечваліся ў Мінску. За выкананне гэтай баявой аперацыі я атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

***– А хто ўваходзіў у склад экіпажа Вашай «машыны баявой»?***

– Наш экіпаж быў інтэрнацыянальным: службу неслі ўзбек, дагестанец і два беларусы. Паколькі нас большасць, мы на танку напісалі «Мінск». На іншых машынах былі адпаведныя геаграфічныя надпісы. Так лягчэй было знаходзіць землякоў.

***– Наколькі страшна было перад пачаткам баявых аперацый?***

– Страх прыходзіў пасля іх правядзення, калі ўспаміналі, аналізавалі і бачылі чым магло б усё скончыцца. За спінамі адзін аднаго не хаваліся, усе разумелі, што выстаяць і перамагчы можна толькі тады, калі ўсе заадно, калі ўсе разам.

***– Ці быў у воіна-інтэрнацыяналіста вольны час?***

– Безумоўна. Нам паказвалі фільмы, кнігі было калі пачытаць, пісьмы напісаць. Аднойчы нават Л. Лешчанка з канцэртам прыязджаў.

***– Як склаўся Ваш лёс пасля вайны?***

– Папраўляў здароўе, затым вярнуўся ў родную вёску. Вайна доўга не хацела мяне адпускаць, прыходзіла ў сны, трывожыла раны. Але мірнае спакойнае жыццё ўзяло верх: душэўны боль адыходзіў. У 1987 годзе я ажаніўся, нарадзіліся дзеці, пайшлі звычайныя будзённыя клопаты.

***– У хуткім часе на службу будзе прызваны Ваш сын. Якой, Вы думаеце, будзе яго служба?***

– Як бацька я рады, што жыву ў Беларусі, дзе няма «гарачых кропак». Гэта значыць, што мой сын будзе служыць на роднай зямлі, і за яго жыццё я магу не хвалявацца. Ён выканае свой воінскі абавязак і вернецца дадому.

Гутарыла **К. Дзеравяга**,
вучаніца 9 класа
Ломашаўскай СШ